# Запаўняем «пашпарт часціцы»

**Факультатыўны занятак па беларускай мове ў 7 класе**
**па праграме факультатыўнага курса “ Слова ў тэксце”**

**А. А. Жук,**
**настаўніца беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі**
**Свіслацкай СШ Асіповіцкага раёна**

**Тэма. Часціца як службова часціна мовы. Роля часціц у маўленні**

**Мэта занятка**: стварыць умовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў па засваенні тэмы і выкарыстанні атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці.

**Задачы**

**Навучальная:** мяркуецца, што напрыканцы занятка вучань паспяхова выканае кантрольнае заданне.

**Задачы асобаснага развіцця**: у выніку выканання навучальных задач садзейнічаць развіццю ўмення распазнаваць часціцы, адрозніваць іх ад іншых службовых часцін мовы, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю ў тэкстах; правільна ўжываць часціцы ў вусным і пісьмовым маўленні;

Садзейнічаць развіццю камунікатыўных уменняў, навыкаў узаемадзеяння.

Стварыць умовы для самарэалізацыі асобы вучняў у навучальнай дзейнасці.

**Тып заняткаў**: засваенне новых ведаў.

**Выкарыстаныя тэхналагічныя падыходы і прыёмы навучання**: інтэрактыўнае навучанне.

**Абсталяванне:** раздатачны матэрыял, мультымедыйны праектар, прэзентацыя.

## Ход заняткаў

**1 этап. Арганізацыйны**

**Мэта этапа** : псіхалагічна падрыхтаванасць класа да ўрока, арганізацыя ўвагі ўсіх вучняў.

**Педагагічная задача**: арганізаваць і падрыхтаваць вучняў да працы.

Добры дзень, паважаныя вучні, добры дзень, шаноўныя госці! Пачынаць любую справу патрэбна з добрага настрою. Створым добры, дружалюбны настрой. Усміхніцеся адзін аднаму, нашым гасцям.Сядайце.

Перад вамі на дошцы два плакаты. На адным намалявана яблыня, на другім – лімоннае дрэва. На партах у вас ляжаць выразаныя з паперы яблыкі і лімоны. Гэта невыпадкова. Справа ў тым, што зараз вы павінны вырашыць для сябе, што вы чакаеце (хацелі б атрымаць) ад сённяшніх заняткаў і чаго вы асцерагаецеся (баяцеся). Вашых спадзяванняў і асцярог можа быць некалькі.

Свае спадзяванні запішыце на яблыках (чаму на яблыках, я думаю, зразумела – яблык многа не бывае, а вось лімонаў многа не з’ясі, праўда?), пагэтаму асцярогі запішам на лімонах. Пры дапамозе скотча прымацуйце фрукты на галінках дрэў.

*(Настаўнік зачытвае спадзяванні і асцярогі вучняў.)*

– У канцы заняткаў мы яшчэ раз звернемся да запісаў на дрэвах і паглядзім, ці змяніліся нашы спадзяванні і асцярогі.

**2 этап. Арыентацыйна – матывацыйны**

**Мэта этапа**: пазнавальная падрыхтаванасць, наяўнасць матывацыі, самавызначэнне на канчатковы вынік занятка.

**Педагагічная задача:** актуалізаваць апорныя веды, сфарміраваць пазнавальныя матывы, стварыць умовы для самавызначэння вучняў на дзейнасць і яе вынік.

– Ну а зараз нам трэба даведацца тэму, над якой сёння будзем працаваць. У маіх руках вы бачыце рознакаляровыя карткі, на іх запісаны пытанні па тэме “ Службовыя часціны мовы”. Кожны з вас атрымае адну картку з адным пытаннем. Калі вы правільна адказваеце на пытанне, на слайдзе адкрываецца квадрат таго ж колеру, што і ваша картка. І такім чынам мы даведаемся тэму занятка.

*(Настаўнік раздае карткі, вучні перагортваюць іх толькі тады, калі апошні атрымае картку)*

Пытанні:

– Чым службовыя часціны мовы адрозніваюцца ад самастойных часцін мовы?

– Пералічыце службовыя часціны мовы.

– Што называецца прыназоўнікам?

– Якія бываюць прыназоўнікі па значэнні? Прывядзіце прыклады.

– Што называецца злучнікам?

– Якія бываюць злучнікі па значэнні? Прывядзіце прыклады.

Н.: Малайцы! Адказы правільныя. І цяпер мы дакладна ведаем, што працуем сёння над тэмай : “ Часціца як службовая часціна мовы. Роля часціц у маўленні “ . Запішыце тэму ў свае рабочыя лісткі. У канцы занятка па гэтай тэме вам трэба будзе выканаць тэставае заданне. Яно ёсць у вашых рабочых лістках. Калі ласка, прачытайце фармулёўку заданняў, яшчэ раз паглядзіце на тэму, а таксама звярніце ўвагу на слайд і паспрабуйце сфармуляваць задачы, якія вам трэба вырашыць на працягу нашага занятка.

– Да канца занятка мы будзем

Ведаць… ( што называецца часціцай);

Умець… ( распазнаваць часціцы, адрозніваць іх ад іншых службовых часцін мовы, правільна пісаць часціцы) ;

Паспяхова выканаем… ( тэставае заданне).

Такім чынам, на сённяшнім уроку мы павінны:

Навучальная: мяркуецца, што напрыканцы занятка вучань паспяхова выканае тэставае заданне.

Задачы асобаснага развіцця: у выніку выканання навучальных задач садзейнічаць развіццю ўмення распазнаваць часціцы, адрозніваць іх ад іншых службовых часцін мовы, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю ў тэкстах; правільна ўжываць часціцы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Садзейнічаць развіццю камунікатыўных уменняў, навыкаў узаемадзеяння.

Стварыць умовы для самарэалізацыі асобы вучняў у навучальнай дзейнасці.

**3 этап. Аперацыйна-пазнавальны**

**Мэта этапа**: правільнасць і ўсведамленне асноўнага зместу вучэбнага матэрыялу, пазнавальная актыўнасць вучняў.

**Педагагічная задача**: арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў, стварыць сітуацыю ўзаемадзеяння.

Задачы паставілі, пачынаем іх вырашаць. Першая задача, якую нам трэба вырашыць – даведацца, што называецца часціцай. У вашых лістках ёсць табліца " Пашпарт часціцы"( і на слайдзе). Зараз, працуючы з тэарэтычным матэрыялам, які таксама ёсць у вас на партах, паспрабуйце даць характарыстыку гэтай часціне мовы і запішыце патрэбную інфармацыю ў пустыя калонкі.

Вучні, карыстаючыся тэарэтычным матэрыялам, запаўняюць табліцу ў картках, рыхтуюць адказы на пытанні пра часціцу:
*а). Агульнае значэнне.*
*б). Марфалагічныя прыметы.*
*в). Сінтаксічная роля.*
Вучні расказваюць пра часціцу, карыстаючыся сваімі карткамі.

Н.: У вашых лістках пасля табліцы ёсць практыкаванне. Кожны з вас па чарзе чытае сказ, называе часціцу, спрабуе вызначыць разрад часціцы і значэнне, якое надае яна словам, словазлучэнням ці сказам.

1. Прыйшоў якраз перад пачаткам сходу. 2. Заснула яна толькі пад раніцу. 3. Вось гэты дом. 4. І я б касіў, каб хто касу насіў. 5. Няўжо гэты камень нельга падняць? 6. Так, я ведаю гэта.

Н.: Скажыце, а ці ўсе адценні мы зараз з вамі назвалі, што часціцы могуць надаваць словам? Пагэтаму зараз вы самастойна папрацуеце з яшчэ адной таблічкай, якая дапаможа вам сістэматызаваць веды пра асноўныя значэнні часціц

Ваша задача запоўніць першую графу табліцы:

| **ЧАСЦІЦЫ** | |
|---|---|
| **Значэнне часціц** | **Прыклады часціц** |
| 1. Указанне | Восць, вунь, гэта<br>Амаль, менавіта, якраз, проста, іменна,сапраўды<br>Толькі, ледзь, хоць, хоць бы, выключна |

| | |
|---|---|
| | Так, але, ну, ага<br>Не, ні, ані<br>Ці, хіба, няўжо, як жа<br>Нават, аж, дык, ды, і, -такі, ажно<br>Вось дык, што за, ну і, колькі, як , якія<br>Бы ( б), хай, няхай, давай, давайце |

*(Вучні агучваюць свае запісы.)*

Як вы думаеце, што мы зараз будзем рабіць? Будзем замацоўваць атрыманыя веды. Я прапаную вам зноў-такі рознакаляровыя карткі з заданнямі. *(Кожны вучань атрымлівае картку, выконвае заданне. Потым вучні знаходзяць сваю пару па колеры, суадносяць сваё рашэнне з рашэннем аднакласніка, каменціруюць адказы, параўноўваюць сваё рашэнне з рашэннем на слайдзе.)*

Адна з задач, якую мы вырашаем на занятку, гучыць наступным чынам: мы павінны ўмець вызначаць сэнсава-стылістычную ролю часціц ў тэкстах. Пагэтаму зараз прапаную вам правесці міні – даследаванне, якое накіравана на асэнсаванне сэнсава-стылістычнай ролі часціц у тэксце. Вашай увазе я прапаную тэкст. *(На слайдзе і ў рабочых лістках.)*

***Тэкст. Прачытайце тэкст. Вызначце ролю часціц у ім. Параўнайце тэкст з часціцамі і без іх. Зрабіце вывад.***

Як прыемна прайсціся аднаму па дарозе і ў добрым настроі! Колькі перадумаеш усяго, як хораша памарыш, паспрачаешся са сваімі нябачнымі праціўнікамі! А колькі варыянтаў новай рэчы – я маю на ўвазе пісьменніка – можа з’явіцца ў выніку такога роздуму! Ніхто табе не перашкаджае: ты можаш размаўляць са сваімі героямі, гаварыць за іх, прыслухоўвацца да іх галасоў, спяваць, не маючы слыху, складаць вершы, не маючы таленту. Словам, можаш рабіць, што захочаш. У такім свеце быў Пятро.

–Назавіце часціцы і вызначце іх ролю ў тэксце.

–Прачытайце тэкст без часціц.

–Які тэкст быў прыгажэйшым? Скажыце, ці памяняўся без часціц агульны змест тэксту?

–Які вывад мы можам зрабіць аб ролі часціц у тэкстах? ( Без часціц агульны змест тэксту не змяніўся, але іх выкарыстанне надае выказванням дакладнасць, выразнасць, эмацыянальнасць, бо часціцы перадаюць разнастайныя дадатковыя адценні значэння.)

Яшчэ адна задача нашага занятка – умець правільна пісаць часціцы. Пагэтаму прыспеў час ***“ Арфаграфічнай хвілінкі”***. Перад вамі набор слоў з часціцамі і з тымі часціцамі, якія страцілі сваю самастойнасць і сталі або прыстаўкамі, або постфіксамі. Ваша задача: раскрыць дужкі, правільна запісаць словы, пракаменціраваць атрыманыя вынікі.

Дзе(сьці), што(небудзь), абы(хто), абы(з) кім, чый(сьці), каго(ж)небудзь, зусім(такі), усё(такі), усё(ж)такі, сказаў(такі), (такі)сказаў праўду, сказала(ж), сказаў(бы).

– Ці можам мы зараз правільна напісаць словы з часціцамі –такі, бы, ж, жа?

– А чаму?

– Што нам трэба зрабіць, каб правільна напісаць словы?

Знайдзіце на партах тэарэтычны матэрыял “ Правапіс часціц”. Знайдзіце патрэбную інфармацыю і закончыце схемы (на слайдзе і ў рабочых лістках).

*(Вучні працуюць, потым агучваюць вынікі.)*

– Што даведаліся аб правапісе часціц БЫ (Б), ЖА (Ж)?

Давайце вернамся да слоў, у напісанні якіх у нас узніклі цяжкасці і запішам іх. *(Вучні запісваюць. Каменціруюць.)*

Н.: Да выканання кантрольнага задання застаўся толькі адзін від дзейнасці, але гэтыя заданні групавыя, пагэтаму давайце падзелімся на 2 групы. У мяне ў руках нумары 1, 2, выцягваем нумары. Тыя, хто выцягнуў 1, садзяцца за адну парту, тыя, хто выцягнуў 2, садзяцца за другую парту. Гэтыя заданні на вашу кемлівасць, уважлівасць, знаходлівасць. Кожная група атрымае сваю картку. Пасля таго, як кожная група выканае сваё заданне, вы мяняецеся імі, і потым ужо другая група адказвае на пастаўленае ў картцы пытанне, выказвае сваё меркаванне наконт той праблемы, якая закранаецца ў заданні. Потым карткі вяртаюцца да “ гаспадароў”, якія і агучваюць вынікі з улікам дапаўненняў таварышаў. *(Прыём “ Сінтэз ідэй”.)*

***Заданні для першай групы:***

Рашыце лінгвістычную задачку.

Ці могуць часціцы страчваць сваю самастойнасць і станавіцца марфемамі слова – прыстаўкамі або постфіксамі? Калі так, то прывядзіце прыклады.

Заданні для другой групы:

Рашыце лінтвістычную задачку

Да юнака падышлі трое знаёмых. Першы спытаў: “ Як ты закончыў школу?”

Другі ўсклікнуў: “ Як, ты закончыў школу!”

Трэці сказаў: “ Раскажы, як ты закончыў школу.”

Чым адрозніваюцца гэтыя сказы па сэнсе, будове і інтанацыі? Якой часцінай мовы з’яўляецца слова ЯК? ( прыслоўе, часціца, злучнік)

Адказ да задання 1 групы: Могуць. Так, постфіксамі ў займенніках і прыслоўях сталі –небудзь і –сьці ( хто-небудзь, хтосьці), таксама словы абы, не, ні, ужываюцца і як часціцы ( абы зрабіць, не сказаць, ні свет ні зара) , і як прыстаўкі: абы-хто, невялікі, ніхто.

Адказ да задання 2 групы: сказы розныя па мэце выказвання, будове. У 1 сказе 2 як” – прыслоўе, у 2 – часціца, у 3 – злучнік.

**4 этап. Кантрольна – карэкцыйны**

Мэта этапа: выкананне тэставага задання, выяўленне цяжкасцей, карэкцыя іх.

Педагагічная задача: устанавіць усвядомленасць засваення новага матэрыялу, стварыць умовы для самакарэкцыі і самаацэнкі ведаў, уменняў , стымуляваць вучняў на самаадукацыю.

***Тэст***

1. Адзначце правільнае сцвярджэнне:

Часціцай называецца:

А) службовая часціна мовы, якая выражае залежнасць назоўніка або займенніка ад іншых слоў у сказе;

Б) службовая часціна мовы, якая выражае розныя дадатковыя адценні значэння слоў, словазлучэнняў і сказаў, а таксама служыць для ўтварэння формаў слова ( ладоў дзеяслова);

В) службовая часціна мовы, якая служыць для сувязі слоў у словазлучэнні і сказе.

2. Адзначце радок, дзе ўсе сцвярджэнні правільныя:

Часціцы падзяляюцца на наступныя разрады:

А) сэнсавыя, мадальныя, эмацыянальныя, формаўтваральныя;

Б) прасторавыя, прычынныя, тлумачальныя, мэтавыя;

В) злучальныя, падпарадкавальныя, вытворныя, невытворныя.

3. Адзначце радок, дзе ўсе часціцы формаўтваральныя:

А) вось, вунь, гэта;

Б) бы, хай, давайце;

В) хоць бы, як, няхай.

4. Адзначце правільнае сцвярджэнне:

Формаўтваральныя часціцы служаць для ўтварэння наступных форм дзеяслова:

А) формы загаднага ладу;

Б) формы будучага часу;

В) формы ўмоўнага ладу;

Г) формы абвеснага ладу.

5. Адзначце радок, дзе часціцы са словамі трэба пісаць праз злучок:

А) усё(такі), прыйшоў(такі), напісала( б)

Б) прачытаў(бы), дзе(сьці), усё(ж)(такі);

В) зноў(такі) , дзе(небудзь), сказаў(такі).

Праверце сябе, ацаніце. *(Адказы на слайдзе.)* Падыміце руку, хто без памылак выканаў 1 заданне.( +малайцы, вы разабраліся з паняццем часціца): хто беспамылкова выканаў 2 заданне, 3, 4, 5?

Давайце ўспомнім тыя задачы, што ставілі ў пачатку занятка. *(слайд)* Як вы думаеце, мы з імі справіліся? Справіліся. На наступных занятках мы працягнем размову пра часціцу.

**5 этап. Рэфлексія**

Мэта: усведамленне значнасці навучальнай дзейнасці і сітуацыя поспеху.

Педагагічная задача: стварыць умовы для самаацэнкі дзейнасці вучняў і ўсведамлення імі асобасных сэнсаў у вывучэнні тэмы.

–Я прапаную ацаніць сваю працу на занятку і скласці творчую справаздачу – сінквейн

Назоўнік –тэма

2 прыметнікі
3 дзеясловы
Сказ – меркаванне
Назоўнік – сутнасць
*Вучні агучваюць атрыманыя вынікі.*

Настаўнік: малайцы! І апошняе, што мы павінны зрабіць на занятку – наведаць наш фруктовы сад. Давайце паглядзім, ці спраўдзіліся нашы спадзяванні *(разам з вучнямі правяраюць)*, а цяпер паглядзім ці пацвердзіліся нашы асцярогі *(калі не пацвердзіліся, зняць фрукты з дрэва.)*. Дзякуй вам за працу! Да пабачэння на наступным занятку.

**ДАДАТАК**

**Рабочыя сшыткі:**

Дата________________________________________________________

Прозвішча, імя________________________________________________

Тэма занятка__________________________________________________
______________________________________________________________

У канцы занятка мы будзем
ведаць_______________________________________________________,
умець________________________________________________________,
паспяхова выканаем___________________________________________
______________________________________________________________.

**ПАШПАРТ ЧАСЦІЦЫ**

| Часціца | Характарыстыка | Прыклады |
|---|---|---|
| Агульнае значэнне | | |
| Разрады часціц | | |
| Марфалагічныя прыметы | | |
| Сінтаксічная роля | | |

**Практыкаванне 1.** Прачытайце сказы, назавіце часціцы і вызначце, якія дадатковыя адценні значэння надаюць яны словам, словазлучэнням ці сказам.

1. Прыйшоў якраз перад пачаткам сходу. 2. Заснула яна толькі пад раніцу. 3. Вось гэты дом. 4. І я б касіў, каб хто касу насіў. 5. Няўжо гэты камень нельга падняць? 6. Так, я ведаю гэта.

| **Часціцы** | | |
|---|---|---|
| **Разрады** | **Значэнне часціц** | **Прыклады** |
| 1.Сэнсавыя | | Вось, вунь, гэта |
| | | Амаль, менавіта, якраз, проста, іменна,сапраўды |
| | | Толькі, ледзь, хоць, хоць бы, выключна |
| 2.Мадальныя | | Так, але, ну, ага |
| | | Не, ні, ані |
| | | Ці, хіба, няўжо, як жа |
| 3.Эмацыяналь-ныя | | Нават, аж, дык, ды, і, -такі, ажно |
| | | Вось дык, што за, ну і, колькі, як , якія |
| 4.Формаўтвара-льныя | | Бы ( б), хай, няхай, давай, давайце |

**Міні – даследаванне:**

Прачытайце тэкст. Вызначце ролю часціц у ім. Параўнайце тэкст з часціцамі і без іх. Зрабіце вывад.

*Як* прыемна прайсціся аднаму па дарозе і ў добрым настроі! *Колькі* перадумаеш усяго, *як* хораша памарыш, паспрачаешся са сваімі нябачнымі праціўнікамі! *А колькі* варыянтаў новай рэчы – я маю на ўвазе пісьменніка – можа з’явіцца ў выніку такога роздуму! Ніхто табе *не* перашкаджае: ты можаш размаўляць са сваімі героямі, гаварыць за іх, прыслухоўвацца да іх галасоў, спяваць, *не* маючы слыху, складаць вершы, *не* маючы таленту. Словам, можаш рабіць, што захочаш. У такім свеце быў Пятро.

Вывад:

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

**Арфаграфічная хвілінка**

Дзе(сьці), што(небудзь), абы(хто), абы(з) кім, чый(сьці), каго(ж)небудзь, зусім(такі), усё(такі), усё(ж)такі, сказаў(такі), (такі)сказаў праўду, сказала(ж), сказаў(бы).

**Закончыце схему**

Часціца ***такі*** пішацца




**Тэст**

1. **Адзначце правільнае сцвярджэнне:**

Часціцай называецца:

А) службовая часціна мовы, якая выражае залежнасць назоўніка або займенніка ад іншых слоў у сказе;

Б) службовая часціна мовы, якая выражае розныя дадатковыя адценні значэння слоў, словазлучэнняў і сказаў, а таксама служыць для ўтварэння формаў слова ( ладоў дзеяслова);

В) службовая часціна мовы, якая служыць для сувязі слоў у словазлучэнні і сказе.

**2. Адзначце радок, дзе ўсе сцвярджэнні правільныя:**

Часціцы падзяляюцца на наступныя разрады:

А) сэнсавыя, мадальныя, эмацыянальныя, формаўтваральныя;

Б) прасторавыя, прычынныя, тлумачальныя, мэтавыя;

В) злучальныя, падпарадкавальныя, вытворныя, невытворныя.

**3. Адзначце радок, дзе ўсе часціцы формаўтваральныя:**

А) вось, вунь, гэта;

Б) бы, хай, давайце;

В) хоць бы, як, няхай.

**4. Адзначце правільнае сцвярджэнне:**

Формаўтваральныя часціцы служаць для ўтварэння наступных форм дзеяслова:

А) формы загаднага ладу;

Б) формы будучага часу;

В) формы ўмоўнага ладу;

Г) формы абвеснага ладу.

**<u>5. Адзначце радок, дзе часціцы са словамі трэба пісаць праз злучок:</u>**

А) усё(такі), прыйшоў(такі), напісала( б)

Б) прачытаў(бы), дзе(сьці), усё(ж)(такі);

В) зноў(такі) , дзе(небудзь), сказаў(такі).

**Сінквейн**

Назоўнік – тэма Часціца

2 прыметнікі

___________________________________

3 дзеясловы

__________________________________________

Сказ – меркаванне

________________________________________________

Назоўнік – сутнасць

________________________________________________

**Тэарэтычны матэрыял. Часціца як часціна мовы.**

<u>Часціцы – службовая часціна мовы, якая надае розныя дадатковыя адценні значэння словам, словазлучэннм ці сказам або служыць для ўтварэння формаў слова ( ладоў дзеяслова).</u>

<u>Часціцы з’яўляюцца нязменнымі словамі</u>. Яны далучаюцца да самастойных часцін мовы, словазлучэнняў і сказаў, самастойна не ўжываюцца і <u>не з’яўляюцца членамі сказа.</u> <u>Часціцы не маюць выразнага лексічнага значэння</u>. Іх значэннем з’яўляецца тое дадатковае сэнсавае адценне, якое яны надаюць словам, словазлучэнняі ці сказам.

Паводле значэння і ролі ў сказе часціцы падзяляюцца на 4 разрады:

- **<u>Сэнсавыя;</u>**
- **<u>Мадальныя</u>**
- **<u>Эмацыянальны</u>**
- **<u>Формаўтваральныя.</u>**

Да **сэнсавых** адносяцца часціцы, якія надаюць словам дадатковы сэнсавыя адценні. Сярод іх вылучаюць тры групы: **указальныя *( вось, вунь, гэта);*** **удакладняльныя *( амаль, іменна, проста, сапраўды, якраз);*** **абмежавальныя *( толькі, хоць, хоць бы, ледзь, выключна).***

Да **мадальных** адносяцца часціцы, якія надаюць выказванню розныя мадальныя адценні. У залежнасці ад гэтых адценняў мадальныя часціцы падзяляюцца **на сцвярджальныя (** ***так, ага, ну, але);*** **адмоўныя *( не, ні, ані);*** **пытальныя *( ці, хіба, няўжо, а).***

**Эмацыянальныя** часціцы выражаюць розныя эмацыянальныя адценні ( радасць, здзіўленне, захапленне) або ўзмацнюць выразнасць выказвання.

Сярод іх вылучаюць **клічныя часціцы *( што за, як, вось дык, ну і )*** **і ўзмацняльныя *( нават, і, дык, жа(ж), аж ( ажно), -такі).***

**Формаўтваральныя часціцы** служаць для ўтварэння формаў **умоўнага ладу дзеяслова *( бы(б))*** **і загаднага ладу дзеяслова *( хай, няхай, давай, давайце).***

**Тэарэтычны матэрыял. Правапіс часціц**

Пры напісанні часціц трэба кіравацца наступнымі правіламі:

1) Часціцы ***бы ( б) , жа ( ж)*** заўсёды пішуцца асобна, прычым ***бы*** і ***жа*** пішуцца пасля слоў, якія заканчваюцца на зычны *( сказаў бы, сказаў жа)* , а часціцы ***б*** і ***ж*** пішуцца пасля слоў, якія заканчваюцца на галосны ( сказала б, сказала ж);

*2)* Часціца ***-такі*** пішацца праз злучок, калі стаіць пасля дзеясловаў, да якіх адносіцца ( *сказаў-такі, прыйшла-такі*). І ў складзе слоў ***зноў-такі, зусім-такі, даволі-такі, так-такі, усё-такі);*** калі часціца ***-такі*** стаіць перад словам ці калі разрываецца іншымі словамі, то яна пішацца асобна: *такі сказаў праўду, ён такі прыйшоў, усё ж такі мы паміраліся, зайшла ж такі;*

***Чырвоная картка***

Прачытайце сказы. Падкрэсліце часціцы. Вызначце значэнне часціц. Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.

1. Размову вялі галоўным чынам падлоўчы з настаўнікам, а ўсе іншыя слухалі і толькі зрэдку ўстаўлялі свае словы.2. Родная прырода жыве ў кожнай кнізе Петруся Броўкі, амаль у кожным яго вершы. 3. Хай свята дружбы лепшым святам будзе, хай векам дружбы наш завецца век…

***Сіняя картка***

Прачытайце сказы. Падкрэсліце часціцы. Вызначце значэнне часціц. Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.

1. Прысеў наш Яська, закруціўся! Ды як пайшоў, ды як пусціўся! 2. Калі стамлюся некалі праз меру, адчуць бы мне падтрымку рук тваіх. 3. У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, якраз у тых мясцінах, дзе знаходзіцца вёска Рудня, геолагі знайшлі жалезную руду.

***Зялёная картка***

Прачытайце сказы. Падкрэсліце часціцы. Вызначце значэнне часціц. Надпішыце над часціцай яе разрад і значэнне.

1. Хто ж не любіць душою нашу маці-зямлю! 2. Як хітра, мудра збудавана! Як чыста, хораша прыбрана! 3. “ Ці не чакаеш каго, Ганначка?” – “ Не, мама”.



